ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
16
СТУДЗЕНЯ
1992
№ 1
(1697)

# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА
ОРДЭНА
ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА
СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА

## «МЫ ПОЙДЗЕМ ІНШЫМ ШЛЯХАМ»




Весткі аб магчымай забастоўцы настаўнікаў выклікалі заканамернае пытанне: магчыма, не толькі сярэдняй, але і вышэйшай школы? Ці не збіраецца Савет старшыняў прафкомаў ВНУ Рэспублікі Беларусь заклікаць выкладчыкаў і супрацоўнікаў выйсці на плошчу — у сувязі з тым, што патрабаванні Звароту да парламента і ўрада, з якім Савет выступіў 28 лістапада, пакуль не выкананы?

Анатоль Васільевіч ПАЎЛАЎ, старшыня прафкома супрацоўнікаў БДУ, паведаміў нам, што забастоўка ў даным выпадку — справа апошняя. 9 студзеня адбыўся Пленум Беларускага Рэспубліканскага камітэта прафсаюзаў, які абраў афіцыйны, законны шлях выканання патрабаванняў работнікаў народнай адукацыі. На Пленуме была створана прымірыцельная камісія з 9 чалавек. Яна ўжо пачала перагаворы з урадам. Сярод патрабаванняў, з якімі выступіць камісія на гэтых перагаворах, у тым ліку, увядзенне Закона Рэспублікі Беларусь аб народнай адукацыі з 1 студзеня (усіх артыкулаў Закона, а не асобных, як патрабаваў лістападаўскі Зварот), а таксама стопрацэнтная выплата ў купонах тых акладаў, якія ніжэй за 1000 рублёў.

Калі перагаворы з урадам застануцца беспаспяховымі, плануецца стварыць арбітражную камісію на змену прымірыцельнай. І толькі ў выпадку абсалютна нулявога выніку нарэшце будзе сабрана рэспубліканская прафсаюзная канферэнцыя, якая абмяркуе рашэнне аб правядзенні забастоўкі і прагаласуе за яго.

Прафсаюзныя лідэры шчыра спадзяюцца, што развіццё падзей не прывядзе ў гэта рэчышча.

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

Афіцыёз начыста знікае са старонак перыядычнага друку. Вызваленыя выданні навыперадкі кінуліся за сенсацыяй, часта не зважаючы на дакладнасць і праўдзівасць інфармацыі. Гэта жахліва. Бо не спрыяе стабільнасці і пагражае нашаму і без таго напалову звар'яцеламу грамадству чуткамі. Чуткі ўзмацняюць недавер, які ніякім чынам не спрыяе ўзаемаразуменню.

Каб пазбегнуць недагаворванняў, з новага года адкрываецца ў «Беларускім універсітэце» новая рубрыка «Весткі з рэктарата». Гэта значыць, што ў кожнага чытача з'яўляецца магчымасць атрымліваць інфармацыю з першых рук.

Сёння навінамі дзеліцца прарэктар **Пётр Дзмітрыевіч КУХАРЧЫК.**

*Распараджэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 1992 года ў адпаведнасці з пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб маёмасці КПБ — КПСС» на баланс Белдзяржуніверсітэта перададзены вучэбны корпус былога Інстытута паліталогіі (а яшчэ раней — ВПШ) па вуліцы К. Маркса, 31 і яго вучэбна-матэрыяльная база, а таксама інтэрнат па вуліцы К. Маркса, 24.*

*У катастрафічным становішчы з плошчамі знаходзяцца сёння філфак, ФЭФ, ФПМІ, гістарычны факультэт. У аварыйным стане знаходзіцца і стары фізічны корпус.*

*Над пытаннем перадачы новых плошчаў працуе зараз створаная ў рэктарацe камісія.*

●

*Міністэрствам адукацыі распрацаваны прапановы Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь аб змяненні дзеючай сістэмы стыпендый імя выдатных дзеячоў навукі, культуры, грамадскага руху.*

*Прапануецца, у прыватнасці, скасаваць існаванне на Беларусі стыпендый, якія не маюць дачынення да гісторыі рэспублікі, і ўвесці шэраг новых стыпендый для студэнтаў і аспірантаў ВНУ.*

*Такім чынам, не пазней 20 студзеня рэктарат чакае прапаноў, якія датычаць паяўлення новых імянных стыпендый. Яны павінны быць далучаны да ўжо прапанаваных: імя У. І. Пічэты, А. Н. Сеўчанкі, Л. І. Кісялеўскага, М. Гусоўскага.*

●

***Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па забеспячэнню сацыяльнай абароны насельніцтва ва ўмовах лібералізацыі цэн» сведчыць літаральна наступнае: «Захаваць дзейнічаючую (за кошт бюджэтных сродкаў і па-за бюджэтных фондаў) сістэму датацый на памяншэнне кошту харчавання ў студэнцкіх сталовых і буфетах.***

***Міністэрству фінансаў прадугледзець у бюджэце рэспублікі на 1992 год асігнаванні з разліку 5 рублёў у дзень для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў».***

●

*Новыя службовыя аклады вызначаны для прафесарска-выкладчыцкага саставу вышэйшых навучальных устаноў. Згодна з пастановай Дзяржкампрацы Рэспублікі Беларусь у дацэнтаў зарплата ўзрасла ў 2,4 раза, асістэнтаў, якія не маюць вучонай ступені — у 2,5 раза, загадчыкаў кафедрамі — у 2,1 раза ў параўнанні са службовымі акладамі на 1 лістапада 1991 года.*

●

Пад канец, насуперак традыцыі, зусім не салодкая навіна:

***Да гэтае пары не зацверджаны рэспубліканскі бюджэт. Чым гэта пагражае універсітэту? Ніводная з лабараторый і кафедр вось ужо паўмесяца не можа набываць неабходнае абсталяванне, няма магчымасці ўстанаўліваць надбаўкі да службовых акладаў. Хто яго ведае, наколькі багатай будзе ў гэтым годзе універсітэцкая кішэня.***

## ВЫ ЧУЛІ?

***За добрасумленнае выкананне службовых абавязкаў і бездакорную дысцыпліну... Фармулёўка амаль забытая. Але яе можна яшчэ сустрэць у сёняшніх афіцыйных паперах, побач не з інфармацыяй аб прысуджэнні ганаровых званняў, а з буйнымі грашовымі сумамі. Значыць, сумленне і дысцыпліна пакуль у цане. А можа ўпершыню?***

***Трыццаць два афіцэры-выкладчыкі ваеннай кафедры атрымаюць у гэтым месяцы аднаразовае грашовае ўзнагароджанне ў памеры двух службовых акладаў грашовага ўтрымання па пасадзе і воінскім званні. Такое рашэнне прынята ў БДУ у адпаведнасці з Указам былога Прэзідэнта былога СССР «Аб матэрыяльным стымуляванні некаторых катэгорый ваеннаслужачых Узброеных Сіл СССР». Фармулёўка «За добрасумленнае выкананне... і бездакорную дысцыпліну» — менавіта з гэтага Указа.***

***А што ж студэнты, якія займаюцца на ваеннай кафедры пад кіраўніцтвам узорных выкладчыкаў? Яны таксама ўзнагароджаны. Са студзеня тыя з іх, хто ўжо прайшоў сапраўдную тэрміновую вайсковую службу, будуць атрымліваць надбаўку да стыпендыі ў памеры 30 рублёў, тыя ж, хто не служыў у радах СА,— 20 рублёў.***

## У АДКАЗ

# НАША МЕСЦА — ПАД СОНЦАМ

«Універсітэт усё шукае сваё месца...» — так называлася надрукаванае ў «ЛіМе» інтэрв'ю, якое Ю. Дубіна ўзяў у кіраўніка групы па праверцы выканання Закона аб мовах у БДУ, старшыні гарадскога бацькоўскага камітэта А. Шамака. Не ўсе ацэнкі апошняга робяць уражанне справядлівых і аб'ектыўных. А некаторыя наогул патрабуюць абвяржэння. Не будзем прэтэндаваць зараз на гэтую ролю. У якасці першага адказу на атрыманую крыўду звернемя да інфармацыі аб апошніх зрухах на шляху беларусізацыі нашай ВНУ.

9 студзеня адбылося першае пасяджэнне пашыранай секцыі па арганізацыі навучання на беларускай мове навукова-метадычнага савета універсітэта. У складзе секцыі 18 чалавек (яна самая шматлікая ў савеце), прадстаўнікі ўсіх факультэтаў. Яе асноўная задача — метадычнае забеспячэнне навучання на беларускай мове. Адной з галоўных праблем беларускамоўных плыняў, створаных на факультэтах БДУ, застаецца адсутнасць дапаможнікаў і слоўнікаў. Прыродазнаўчым факультэтам неабходны перш за ўсё тэрміналагічныя слоўнікі. Пакуль такі выйшаў толькі для матэматыкаў, рыхтуецца — для геаграфаў. Астатнім давядзецца пакуль пачакаць. Таму на пасяджэнні секцыі вырашана стварыць на прыродазнаўчых факультэтах творчыя калектывы, якія займуцца распрацоўкай такіх слоўнікаў. У саставе кожнага з іх абавязкова будзе філолаг.

Старшынёй секцыі па арганізацыі навучання на беларускай мове зацверджаны загадчык кафедрай беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых факультэтаў У. А. НАВУМОВІЧ.

На мінулым тыдні адбыўся таксама арганізацыйны сход выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якія будуць займацца на курсах беларускай мовы, арганізаваных ва універсітэце. Заняткі будуць весці выкладчыкі БДУ, атрымліваючы грошы з універсітэцкага бюджэту. Навучэнцам курсаў гэта не будзе каштаваць нічога. Цікава выглядае ў колькасных адносінах спіс тых, хто пажадаў займацца на курсах беларускай мовы, бо колькасць не заўсёды залежыць ад таго, адкрываецца на даным факультэце беларускамоўная плынь ці не. На курсы запісаліся: 40 юрыстаў (гэта рэкорд), 36 біёлагаў, 35 прадстаўнікоў ФПМІ, 22 — мехмата, 18 гісторыкаў, 17 выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры палітычнай гісторыі, 11 хімікаў, столькі ж — прадстаўнікоў факультэта радыёфізікі і электронікі, 8 супрацоўнікаў апарата кіравання, 6 географаў, 5 фізікаў, 3 філолагі, 2 прадстаўнікі кафедры педагогікі і столькі ж — кафедры псіхалогіі, нікому не спатрэбілася вывучэнне беларускай мовы на філасофска-эканамічным факультэце (гэта таксама рэкорд).

# ДЭМАКРАТЫ І КАНСЕРВАТАРЫ

**У складаным перапляцтанні палітычных сіл у той ці іншай краіне вылучаюцца, як правіла, правыя, левыя і цэнтр. Кожнае з гэтых утварэнняў, у сваю чаргу, таксама не ўяўляе сабой нешта адзінае. Так, сярод правых ёсць кансерватары і рэакцыянеры, сярод левых — дэмакраты і экстрэмісты. Рэакцыянеры займаюць у палітычнай барацьбе надзвычай правыя пазіцыі, экстрэмісты, наадварот, — надзвычай левыя.**

**Не цяжка зразумець, што экстрэмізм — зваротны бок рэакцыйнасці. Па сутнасці, гэта адно і тое ж. Экстрэмізм — гэта рэакцыйнасць, якая характарызуецца надзвычайным нецярпеннем пры дасягненні сваіх мэт. Абодвум уласціва імкненне да насілля пры вырашэнні сацыяльных праблем.**

**Кансерватары і дэмакраты складаюць палітычны цэнтр: першыя далучаюцца да яго справа, другія — злева.**

**Актуальным для разумення развіцця падзей у нашай рэспубліцы з'яўляецца пытанне, наколькі моцны ў ёй палітычны цэнтр.**



У грамадстве, дзе на працягу больш чым 70 гадоў культываваўся вобраз ворага, палітычны цэнтр — вузкая палоска, справа і злева ад якой размешчаны асноўныя палітычныя сілы.

Разам з тым, як мне здаецца, у нашай рэспубліцы, у параўнанні з іншымі дзяржавамі, што ўзніклі ў межах былога СССР, гэтая палоска значна шырэйшая — у сувязі з шэрагам прычын. Адной з іх з'яўляецца псіхічны склад беларускага народа — яго добразычлівасць, разважнасць, памяркоўнасць у прыняцці рашэнняў, цярплівасць, імкненне да згоды і супрацоўніцтва, а не канфрантацыі. Тут жа можна назваць і меншую, у параўнанні, напрыклад, з былымі рэспублікамі Сярэдняй Азіі, карумпіраванасць наменклатуры. Беларусь менш раскрадзеная, разрабаваная.

Для сапраўднага беларуса не ўласцівы як рэакцыйнасць, так і экстрэмізм. Аднак за стагоддзі праз Беларусь прайшлі шматлікія арміі захопнікаў, якія рабавалі, забівалі, гвалтавалі. Беларускі народ на доўгія гады трапляў у залежнасць ад акупантаў. Усё гэта прыводзіла да змяшэння народаў. Таму сярод сённяшніх рэакцыянераў і экстрэмістаў, незалежна ад таго, якой яны веры і да якой нацыянальнасці сябе далучаюць, бачацца нашчадкі і Чынгіз-Хана, і тых, хто ў 1242 годзе бег з Чудскага возера, і многіх іншых.

I не пра карысць для беларускага народа клапоцяцца гэтыя нашчадкі, а пра асабістую славу, уладу, прывілеі. Большасць грамадзян рэспублікі цудоўна гэта ўсведамляюць. Адмовіўшы ў даверы крайне правым, народ Беларусі не падтрымлівае і крайне левых. Доказам гэтага з'яўляецца змяншэнне працэнту тых грамадзян, якія прымаюць удзел у галасаванні.

Будучае рэспублікі за палітычным цэнтрам. Таму такая актуальная для нас праблема яго фарміравання. На практыцы гэта павінен быць пошук шляхоў да згоды і супрацоўніцтва дэмакратаў і кансерватараў. Каб дасягнуць узаемадзеяння паміж імі, неабходна, перш за ўсё, пераадолець стэрэатыпы, якія склаліся ў свядомасці і мысленні.

Да кансерватараў далучаюць, як правіла, тых людзей, чый сацыяльны рост быў звязаны з іх актыўнасцю ў радах КПСС. Дэмакратамі прынята лічыць тых, хто ніколі не быў у радах гэтай партыі ці даўно, задоўга да вядомых жнівеньскіх падзей, яе пакінуў. Таму распаўсюджана меркаванне, што кансерватар — гэта дрэнна, а дэмакрат — добра. Аднак у жыцці ўсё больш складана. Дрэнна, калі кансерватар — рэакцыянер. Добра, калі дэмакрат — не экстрэміст. Кансерватыўныя і рэакцыйныя сілы не адно і тое ж, першае значна шырэй за другое. Сярод кансерватараў шмат людзей, якія ўсвядомілі неабходнасць рэформ, з'яўляюцца праціўнікамі звароту да старога.

Што датычыцца дэмакратаў, дык да іх ацэнкі трэба падыходзіць дыферэнцыравана. Многія з іх, на мой погляд, — апаратчыкі, якія не атрымаліся ў свой час. Наменклатура не прызнала іх, не прыняла ў сваё асяроддзе з-за залішняй амбіцыёзнасці, самаўпэўненасці, прэтэнзіі на ісціну ў апошняй інстанцыі, проста крыклівасці і г. д. У гэтым, на мой погляд, адна з прычын іх лютай падбухторанасці супраць кансерватараў. Адзначана псіхалагічная заканамернасць: чалавек асабліва моцна пратэстуе супраць тых недахопаў, якімі валодае сам, хоць можа і не ўсведамляць гэтага. У нападках на ўладу хаваецца імкненне да яе, у празмерным абурэнні прывілеямі — жаданне мець іх.

Не хачу, каб мяне далучылі да абаронцаў кансерватызму. Мне значна бліжэй сапраўдныя дэмакраты — іх адкрытасць, гонар, здольнасць да самахвярнасці дзеля іншых, уласны твар і г. д. Аднак нашы недахопы нярэдка з'яўляюцца працягам нашых добрых якасцей. Аналіз таго і другога карысны як у пазнавальным, так і ў практычным плане. Важна ведаць не толькі тое, што адрознівае дэмакратаў ад кансерватараў, але і тое, што іх аб'ядноўвае. Ад гэтага ж залежыць пасяховае іх супрацоўніцтва, адсутнасць якога сёння тармозіць працэс пазітыўных перамен у грамадстве.

Аб'ядноўвае тых і другіх агульначалавечы пачатак, у тым ліку натуральнае славалюбства і жаданне ўладарыць. Адрозніваюць — матывы і характар рэалізацыі сваіх жаданняў і мэт.

Кансерватары маюць, з майго пункту гледжання, галоўным чынам утылітарныя мэты — іх вабіць магчымасць, валодаючы ўладай, распараджацца чужой працоўнай сілай і матэрыяльнымі каштоўнасцямі, а таксама далучэнне з дапамогай гэтага да рознага роду выгад і прывілей. У дэмакратаў жа на першы план выступаюць матывы славалюбства, хоць, зразумела, і яны не забываюць пра свае матэрыяльныя інтарэсы. Але для многіх з іх гэта другаснае. Галоўнае — быць на вачах ва ўсіх, публічна дэманстраваць свой інтэлект і «любоў да народа».

Гістарычны вопыт сведчыць, што асабліва заўзята ад імя народа і быццам бы ў яго інтарэсах выступаюць таталітарныя (фашысцкія, камуністычныя, нацыяналістычныя) сілы, у той час як сапраўдныя дэмакраты, разумеючы, што асновай рэальнай свабоды чалавека з'яўляецца яго эканамічная незалежнасць, не гучна і добрасумленна робяць сваю справу.

Для палітыкаў карысна было б даведацца пра некаторыя заканамернасці псіхалагічнага ўспрымання людзьмі той ці іншай асобы. Мы ўспрымаем іншага чалавека перш за ўсё ў цэлым, і толькі потым — у дэталях. Людзі спачатку вераць (ці не вераць) асобе, а толькі потым, праз прызму гэтай веры, успрымаюць яе меркаванні і ўчынкі. Тое ж самае можна сказаць і наконт «любві да народа». Чалавек, які сапраўды мае глыбокае пачуццё патрыятызму, не будзе дарэмна выстаўляць яго на людзі ў кожным зручным выпадку, таксама, як паважаючы культуру, звычаі і гісторыю свайго народа, не будзе пасміхацца над культурай сваіх суседзяў.

Кожнаму чалавеку ўласціва імкненне да максімальнага выяўлення сваіх здольнасцей і задаткаў. У таталітарнай камуністычнай сістэме ў цэлым шэрагу галін чалавечай дзейнасці асоба магла выявіць сябе не інакш, як толькі ў радах КПСС. Таму людзі ішлі ў гэтую партыю, каб атрымаць магчымасць узняцца па службовай лесвіцы, заняцца любімай справай і г. д. Гэта першае. Другое, уплываць нейкім чынам на грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне можна было зноў жа толькі калі ты член кіруючай партыі. Не ва ўсіх хапала мужнасці стаць на шлях адкрытай барацьбы з сістэмай, аднак супраціўляліся ёй спакваля, унутры партыі. Доказам гэтага з'яўляецца тое, што ў гады таталітарызму фізічнаму знішчэнню і псіхалагічнаму ціску падвяргаліся ў першую чаргу члены КПСС.



Таму навешваць аднолькавыя ярлыкі на ўсіх без выключэння членаў КПСС недапушчальна. Апраўдваць гэта толькі псіхалагічнымі матывамі — недастаткова. Бо тут ёсць і прамы разлік — знішчыць магчымых канкурэнтаў у барацьбе за ўладу. Між тым, адлучэнне дэмакратамі падрыхтаванай да супрацоўніцтва часткі былых членаў КПСС аслабляе патэнцыял абнаўлення грамадства, ствараe цяжкасці, якія можна было б пазбегнуць.

Для палёгкі ў дасягненні згоды паміж кансерватарамі і дэмакратамі важна таксама ўсвядоміць, што яны, як гэта мне ўяўляецца, адрозніваюцца тыпам мыслення. Кансерватар — гэта не толькі прадукт абставін і выхавання, але і асаблівасць мыслення. Для яго характэрнае мысленне разумовае, калі вывады робяцца на падставе маркаванняў, якія ўяўляюць сабой лагічны ланцуг. Дэмакрат, у адрозненні ад кансерватара, мысліць лагічнымі блокамі. Яму ў большай меры ўласцівы інтуітыўны момант у мысленні. Ён здольны ахапіць вывучаемы аб'ект цалкам, адразу, што дазваляе яму больш адэкватна ацэньваць рэчаіснасць, бачыць напрамак развіцця падзей. Аднак калі дэмакрат мае рацыю ў цэлым, дык кансерватар — у дэталях. Калі дэмакрат можа сказаць, што патрэбна рабіць, дык кансерватар здольны адказаць, як гэта трэба рабіць. Дэмакрат — стратэг, кансерватар — тактык.

Тое-сёе трэба ўсвядоміць і кансерватарам.

Наменклатура не прызнала не толькі нецярплівых, невытрыманых, тых, хто не ўмее валодаць сабой. Іншародным целам для яе з'яўляліся і тыя, хто меў гонар і быў незалежны, хто меў асабісты твар і не хацеў яго губляць, не хаваў свой інтэлект і не спяшаўся прыслужваць. Людзей падобнага складу ці не прымалі ў партыю ці, прыняўшы, не давалі расці (зразумела, калі гэтыя людзі не ламаліся і не згіналіся). Гэта моцныя людзі, яны ўстаялі супраць подкупу і запужвання, спакусы прывілей, не схіліліся і вытрымалі. Яны справядлівыя і сумленныя, дысцыплінаваныя і ў меру славалюбівыя. Імі рухае жаданне выправіць справу, а не амбіцыі. І сёння менавіта яны ўяўляюць найбольшую небяспеку для таталітарнай сістэмы, якая ўжо пахіснулася, але яшчэ не адолена. Ва ўсялякім выпадку, значна большую небяспеку, чым тыя лідэры дэмакратычнага руху, якія празмерна амбіцыёзныя, самаўпэўненыя, нецярплівыя да іншадумства (такіх, на жаль, сёння не так ужо і мала).

Менавіта амбіцыёзнасць уяўляе найбольшую небяспеку для дэмакратычнага руху. Яна здольна разбурыць яго. Славалюбівая асоба можа загубіць любую справу, бо вышэй яна ставіць асабістае «Я». Яна перабольшвае свае магчымасці і здольнасці, хапаецца за мноства спраў адразу і не даводзіць іх да канца або выконвае не лепшым чынам. Галоўнае для славалюбцы — як можна больш быць на вачах.

Дэмакраты самі па сабе, без садружнасці з кансерватарамі, не здольныя вывесці рэспубліку з крызісу. Гэта ўжо зразумелі Б. Ельцын, А. Сабчак, Г. Папоў і іншыя дэмакраты ў Расіі, С. Шушкевіч у Беларусі.

Дэмакратам і кансерватарам трэба зразумець, што людзі даруюць многае, калі бачаць, што палітык у сваіх дзеяннях зыходзіць з агульных інтарэсаў, а не інтарэсаў нейкай групы, тым больш, асабістых. Адапаведна і структуры ўлады ў дзяржаве будуць дзеяздольнымі і эфектыўнымі, калі ў іх збяруцца людзі такога складу, незалежна ад таго, кім яны былі — дэмакратамі ці кансерватарамі. Да ўлады ў рэспубліцы павінны прыйсці тыя, хто разумее, што дабрабыт іх дзяцей і ўнукаў знаходзіцца ў прамой залежнасці ад дабрабыту ўсяго народа.

Палітыкі з такім разуменнем ёсць як сярод дэмакратаў, так і сярод кансерватараў. Яшчэ больш грамадзян з такім разуменнем сярод тых, хто пакуль не ўключыўся актыўна ў палітычнае жыццё.

З усімі імі і з мудрасцю народа я звязваю свае надзеі на лепшую будучыню.

Я не вельмі веру ў дапамогу ні з Захаду, ні з Усходу. Першыя вельмі разважлівыя, другія самі знаходзяцца ў складанейшым становішчы.

Патрэбна ўсім разам выбірацца з той дрыгвы, у якой мы апынуліся. У адзіноце ні кансерватарам, ні дэмакратам не выбрацца. І выходзіць са складанейшай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі трэба без падазрэнняў, што нехта кагосьці хоча патапіць, без выхвалення, што вось мы, маўляў, малайцы, а вы — наадварот.

І крый нас, Божа, ад бойкі. Пераможцаў у ёй не будзе.

**І. МАРОЗАЎ,**
**кандыдат**
**філасофскіх навук,**
**член АДПБ.**

## САМ-НАСАМ З РЫНКАМ

Ніводнае намаганне не знікае дарма — нават згодна з законам захавання энергіі. Калі студэнт, які пажадаў выжыць, ідзе зарабляць «на бок», не паляпшаючы гэтым свой прафесійны ўзровень, ад гэтага недарэчнага скіравання энергіі ў рэшце рэшт страчваюць усе.

Згодна з векавой традыцыяй, студэнт павінен вучыцца. Але ці магчыма выжыць, перабіваючыся адной студэнцкай стыпендыяй? Відавочна — трэба шукаць кампраміс.

Ку. На фізічным і хімічным факультэтах можна ўладкавацца ў лабараторыю, дзе акрамя абавязковай «павіннасці» можна рабіць на сябе, напрацоўваць свой навуковы вопыт. (Размова ідзе не пра сімвалічныя лабараторныя працы, прадугледжаныя навучальным планам). Бяруць студэнта ў лабараторыю на палову стаўкі. Грошы невялікія — да новага года гэта было каля 200 рублёў. Але лабараторыя — гэта магчымасць для асобных. Каб зарплатай атрымліваецца каля 100 рублёў (так было да 1992 года). А калі ўсё ж бліжэй да будучай спецыяльнасці? Тады можна звярнуць увагу на малыя прадпрыемствы і кааператывы, якія ў апошнія гады паспяхова растуць пад дахамі кафедр.

На фізічным факультэце налічваецца да 18 малых прадпрыемстваў і кааператываў, дзе студэнты могуць займацца чыста навуковай або практычнай дзейнасцю, звязанай з канструяваннем, укапе, калі з'явіцца больш заказаў, павялічыцца аб'ём работ і дасягне пэўнага ўзроўню тэхналогія — можна будзе гаварыць пра студэнцкую працу.

А студэнт-хімік Васіль АСТАШКА глядзіць на праблему са сваёй званіцы: «У МП студэнты выконваюць работу, з навукай не сутыкаючыся. МП і кааператывы — дзеля самаразвіцця месца не самае ўдалае». Вось дылема: ёсць навука — няма грошай, ёсць грошы —...

# Я б папрацаваць пайшоў...




Шляхі да доўгага праўлянага рубля разнастайныя, яны складаюцца заблытана і шмат у чым выпадкова. Бо без намечанай мэты студэнт праце дзе падвернецца. Нехта гандлюе кветкамі ці ўладкоўваецца рэпетытарам. Між тым, ва універсітэце вучацца дзеля таго, каб праз некалькі год стаць прафесіяналам. Што рабіць, калі чалавек хоча працаваць? І не сярод кветак, а па абранай спецыяльнасці.

Цяжэй за ўсё даводзіцца гуманітарыям. Выключэннем могуць быць журналісты, дзеля якіх цяперашні «газетны бум» утварае шырокае поле дзейнасці. З-за рэзкага павелічэння колькасці друкаваных выданняў існуе пэўны дэфіцыт журналістаў, рэдкім рэдакцыям яны не патрэбны.

Працэс уладкавання на працу прымае глабальныя памеры дзесьці з трэцяга курса. Будучым журналістам патрэбны імя, практыка і грошы, і, зыходзячы з асабістых стымулаў, яны працуюць. Але ці ўрадлівае тое поле іх дзейнасці? Грошай тут небагата. Справа, здаецца, трымаецца на нечым іншым. Адзіная каштоўнасць такой ранняй экзекуцыі для пачынаючых — вопыт, інфармацыя, уваход у тое асяроддзе, дзе ўчарашняму студэнту давядзецца працаваць.

Хапае сёння работы і студэнтам-сацыёлагам. Яны праводзяць лакальныя сацыялагічныя даследаванні па заказах рэспубліканскай Службы грамадскай думкі, Саюза тэатральных дзеячоў, або філіяла Цэнтральнага інстытута па вывучэнню грамадскай думкі. Пра колькасць занятых такім перыядычным заробкам казаць цяжка — лічбы мяняюцца. Кафедра факультэта гэты працэс проста кантралюе, але не ўмешваецца, не ўплывае. Тут няма структуры (навуковай арганізацыі), якая займалася б навуковай працай студэнтаў або апекавала вось такія часовыя заробкі. Таму студэнты адцягваюцца некуды «на бок» — добра, што па спецыяльнасці,— а на факультэце выкладчыкі занепакоены тым, ці не занадта многа ўвагі аддаюць студэнты «пазаўрочнай» працы за кошт навучальнага працэсу.

Здавалася б, фізікам і хімікам ёсць дзе разгарнуцца. Тут вучаць не эмпірыцы, і арыентацыю на будучую спецыяльнасць, далучанасць да пэўнай прафесіі павінны былі б выхоўваць. Студэнту не пашкодзіла б знаёмства са сваёй спецыяльнасцю, як і напрацоўка нейкай базы перад тым, як яго выштурхнуць у рынак. дзе ён мусіць атрымліваць грошы за веды, якасць і майстэрства, набытыя раней.

Вучэбны план пабудаваны так, што студэнты 4—5-х курсаў бязвылазна займаюцца навукай. З другога боку — большая частка ведаў студэнту на практыцы, дзеля будучай працы наогул непатрэбна. Не хапае нейкага больш глыбокага, спецыялізаванага навучання. Гэта толькі адзін з парадоксаў.

Ляшчэ пад час навучання на факультэтах можна працаваць у абраным навуковым напрамзлавіць шанц, патрэбна поўная зацікаўленасць трапіць у лабараторыю, зацікаўленасць і прывядзе студэнта да людзей, якія яго туды ўладкуюць. Рэклама ў гэтым працэсе не прадугледжана. Але і ў лабараторыі праблемы не знікнуць. Новаспечанаму даследчыку цяжка варыцца ва ўласным соку, завіхацца над уласнай тэмай, калі няма дасведчанага настаўніка.

Дагэтуль размова ішла пра так званы «інтэлектуальны» шлях у навуку, да будучай прафесіі. Безумоўна, лабараторыя дае пэўную прастору для інтэлектуальнага развіцця, а паралельна можна патроху зарабляць на гасдагаворах, якія лабараторыя заключае з кліентамі. Разам з раненнем у вытворчасць, продажам навуковых прылад... А на аб'яднанні, якое ўтвараюць хімфак і НДІ ФХП, дзейнічаюць у цэлым два кааператывы і восем малых прадпрыемстваў. Але ў параўнанні з фізфакам на хімічным факультэце магчымасцей уладкавацца ў такое аб'яднанне ў студэнта значна менш. Чаму? Як заўважыў Яўген Міхайлавіч РАХМАНЬКО, кіраўнік НТК «Аналіз ікс» пры БДУ, у перыяд станаўлення рынку, калі камерцыйныя нашы структуры знаходзяцца ў зачатковым стане і ў іх малы аб'ём работ, недапрацаваныя (неналаджаныя) тэхналогіі, запрасіць працаваць студэнтаў немагчыма. Вось на другім эта-

Канешне, найбольш кемлівыя пройдуць праз перашкоды і ўладкуюцца ў МП, кааператывы, у рэшце рэшт, у лабараторыю на пасаду тэхніка. Адзінкі. А праца патрэбна многім. І кожны пакуль што спадзяецца ў пошуках на сябе. Гэтае пытанне выходзіць за межы навучальнай праграмы, і дэканаты ім не займаюцца. У сваю чаргу, у студэнцкім асяроддзі няма ніводнай (!) арганізацыі, якая магла б дапамагчы, накіраваць студэнта да месца працы, блізкай да яго будучай спецыяльнасці.

Будучы рынак абвострыць праблему масавага і неўпарадкаванага імкнення студэнтаў да працы. А пакуль што — працуй дзе можаш...

**Н. ЖУК.**

*** ВОСЬ ДЫЛЕМА: ЁСЦЬ НАВУКА — НЯМА ГРОШАЙ, ЁСЦЬ ГРОШЫ — НЕ ДА НАВУКІ.**

*** ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ЧАЛАВЕК ХОЧА ПРАЦАВАЦЬ? І НЕ СЯРОД КВЕТАК, А ПА АБРАНАЙ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ.**

*** А ПАКУЛЬ ШТО — ПРАЦУЙ, СТУДЭНТ, ДЗЕ МОЖАШ.**

## СЛУЖБА 03

# Піце, але...

**Мы заўсёды радуемся вялікаму і гордаму слову «нараджэнне». Менавіта з гэтага моманту пачынаецца выхаванне дзіцяці, таму паклапаціцца аб яго здароўі неабходна задоўга да зачатка новага жыцця.**

**Вучоныя абследавалі звыш 8000 дзяцей з разумовай адсталасцю і выявілі, што звыш 90 працэнтаў іх былі зачаты ў час розных святаў, калі бацькі ўжывалі спіртныя напіткі. Вельмі важна, як паводзілі сябе бацькі да вяселля. Пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца наступныя даныя. У сем'ях бацькоў, якія часта ўжываюць алкаголь, у першыя месяцы жыцця памёрлі 43,9 працэнта дзяцей, аказаліся псіхічна і фізічна недаразвітымі 36,8 працэнта, здаровымі — усяго 19,3 працэнта. У сем'ях, дзе алкаголь не ўжывалі, здаровымі нарадзіліся 82 працэнты дзяцей, аказаліся нездаровымі — 9,8 працэнта, памёрлі ў першыя месяцы — 8,2 працэнта дзяцей.**

**Шчасце і дабрабыт сям'і залежыць ад многіх прычын. Аднак можна з упэўненасцю сказаць, што падмурак яе будзе больш трывалым пры цвярозым ладзе жыцця.**

**Г. ГАЛЬЧАНЮК, урач.**

## ДАЧАКАЛІСЯ?

# ЯК ВАМ КАРАМЕЛЬ?

У сувязі з павелічэннем стыпендый студэнтаў можна параўнаць хіба што з дзецьмі, якія атрымалі ў якасці навагодняга падарунка карамель. Яны помняць яшчэ смак шакаладных цукерак і ведаюць, што нехта ўжывае шакалад штодзённа. Але карамель — гэта таксама прыемна пасля поўнай адсутнасці салодкага. Тым больш, што ёсць надзея натрапіць на шакаладную начынку ў якой-небудзь цукерцы.

На шакаладную начынку могуць разлічваць перш за ўсё тыя, хто навучаецца па спецыяльнасці «матэматыка» (у дзяржаўных універсітэтах), «прыкладная матэматыка», «механіка», «праграмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм». Для іх устаноўлена стыпендыя памерам 350 рублёў у месяц, для тых, хто вучыцца на «добра» і «выдатна»,— 390 рублёў, а для «круглых» выдатнікаў — 430 рублёў у месяц. У той час як студэнты ўсіх астатніх спецыяльнасцей будуць атрымліваць са студзеня стыпендыю памерам адпаведна 280, 320 і 360 рублёў.

Аднолькавае матэрыяльнае становішча з сярэднімі матэматыкамі, механікамі і праграмістамі будуць мець студэнты, здольныя заслужыць права на атрыманне персанальнай стыпендыі савета ВНУ — яе памер 350 рублёў у месяц. А ўладальнікі імянных стыпендый усіх відаў «пераскочаць» нават матэматыкаў-выдатнікаў: ім прызначана стыпендыя ў 480 рублёў.

Студэнтам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, знаходзіліся пад апекай і дасягнулі 18-гадовага ўзросту да 1.03.91 г., не атрымліваюць штомесячныя грашовыя выплаты на ўтрыманне апекаемых, а таксама тым, хто выхоўваўся ў сем'ях сваякоў, якія не афармілі апеку, і дзеці ваеннаслужачых, што загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязка,— у памеры 370 рублёў у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама добрыя і выдатныя адзнакі — 410 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 450 рублёў у месяц.

Студэнтам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, апекуноў, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні,— у памеры 230 рублёў у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама добрыя і выдатныя адзнакі,— 270 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 310 рублёў у месяц.

Студэнтам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, знаходзяцца на выхаванні ў апекунскіх (прыёмных) сем'ях і дзіцячых дамах сямейнага тыпу і атрымліваюць штомесячныя грашовыя выплаты на ўтрыманне апекаемых, стыпендыі выплочваюцца на агульных падставах.

Студэнтам, якія згодна з рашэннямі ўрада знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, прызначаны стыпендыі ў памеры 115 рублёў у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама добрыя і выдатныя адзнакі,— 155 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 195 рублёў.

Студэнтам з ліку воінаў-інтэрнацыяналістаў — у памеры 345 рублёў, 385 і 425 рублёў адпаведна. А тым з іх, хто знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні,— адпаведна 215, 255 і 295 рублёў у месяц.

Студэнты з ліку былых ваеннаслужачых, якія сталі інвалідамі пасля ранення, кантузіі, калецтва ці захворвання, што былі атрыманы пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязка, будуць атрымліваць стыпендыю ў памеры 425 рублёў у месяц, у тым ліку студэнты, якія маюць толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі,— 465 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 505 рублёў у месяц. Тым жа студэнтам, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, прызначана стыпендыя ў памеры адпаведна 260, 300 і 340 рублёў у месяц.

Апошняя, самая маленькая група студэнтаў,— Героі Савецкага Саюза і Героі Сацыялістычнай Працы. Са студзеня яны будуць атрымліваць стыпендыю ў памеры 485, 525 і 565 рублёў у месяц адпаведна.

Няма ў пастанове Дзяржкампрацы і Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь «Аб памерах дзяржаўных стыпендый навучэнцам ва ўмовах лібералізацыі цэн» канкрэтных лічбаў, якія б называлі памеры стыпендый для аспірантаў. Яны цяпер будуць атрымліваць стыпендыі ў памеры службовых акладаў, якія яны атрымлівалі напярэдадні паступлення ў аспірантуру. А тым з іх, хто паступіў у аспірантуру адразу пасля заканчэння ВНУ, стыпендыі будуць выплочвацца ў памеры службовых акладаў адпаведных спецыялістаў без катэгорыі. Тыя, хто паступіў у аспірантуру да 1.01.92 г., будуць атрымліваць стыпендыі ў памеры службовых акладаў, якія ўстаноўлены з 1.01.92 г. па адпаведных пасадах.

# СТУДЫЁН



## МОВАЙ ЛІЧБАЎ

# Малады ды ранні

Сёлетні спартыўны год ва універсітэце юбілейны. У саракавы раз праводзіцца Спартакіяда. Пачалася яна адносна нядаўна, і таму асноўныя выпрабаванні, як кажуць, яшчэ наперадзе. Таму сёння абмяжуемся толькі табліцай, у якой адлюстраваны вынікі першых стартаў юбілейнай Спартакіяды.

| Від спорту / Факультэт | Баскетбол: юнакі | Баскетбол: дзяўчаты | Крос 1-ы курс | Грэка-рымская барацьба | Дзюдо | Міні-футбол | Агульнакаманднае месца ў леташняй спартакіядзе |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ФПМІ | 7 | 1 | 1 | — | — | 7 | 1 |
| ФЭФ | 8 | 6 | 2 | 8 | 3 | 8 | 8 |
| ММФ | 2 | 4 | 3 | 5 | — | 2 | 6 |
| Фізфак | 1 | 5 | 6 | 4 | 4 | 1 | 3 |
| РФЭ | 4 | 2 | 4 | — | 5 | 4 | 2 |
| Гістфак | 5 | — | 11 | 7 | 6 | — | 11 |
| Геафак | 9 | — | 5 | 2 | 2 | 3 | 5 |
| Біяфак | 12 | 3 | 10 | 6 | 8 | 9 | 7 |
| Хімфак | 6 | — | 8 | 3 | 9 | 11 | 10 |
| Юрфак | 3 | 7 | 9 | 1 | 1 | 10 | 4 |
| Журфак | 11 | — | 7 | — | 7 | 6 | 9 |
| Філфак | 10 | 8 | 12 | 9 | — | 5 | 12 |

*Заўвага: лічбы ў клетцы — занятае месца; працяжнік азначае, што каманда факультэта не ўдзельнічала ў спаборніцтвах.*

Рана рабіць нейкія вывады. Наперадзе яшчэ старты па дванаццаці відах спорту. Але ёсць сэнс у прамежкавым аналізе.

Прыемна здзіўляе ФЭФ. Яшчэ зусім малады па свайму ўзросту, ён громка заяўляе аб сабе на спартыўных пляцоўках, удзельнічае ва ўсіх спаборніцтвах. Добры прыклад для пераймання некаторым факультэтам.

## НА БЕГАВОЙ ДАРОЖЦЫ

# Знаёмцеся

У рэспубліцы з'явілася яшчэ адна газета. На першы погляд, падзея даволі ардынарная для апошняга часу. Столькі новых выданняў паступіла ў «Саюздрук» летась! Але толькі адно з іх спартыўнае — «Прэсс Болл». А цяпер яшчэ адно — «Футбол Беларусі».

Даўняя мара аматараў футбола здзейснілася, і яны атрымалі сваё чыста футбольнае выданне. Заснавальнікамі «Футбола Беларусі» з'яўляюцца: Федэрацыя футбола Рэспублікі Беларусь, ФК «Дынама» Мінск і Дзяржкамспорт РБ.

Сярод журналістаў новай газеты ёсць добра вядомыя ўсім імёны: Сяргей Раманоўскі (галоўны рэдактар) і Аляксандр Майскі. Яны абяцаюць аператыўна паведамляць нам пра жыццё рэспубліканскага і сусветнага футбола і пра многае іншае. Пажывём — паглядзім...

# Зіма. І Ігар на Алімпе

Спартыўныя журналісты рэспублікі вызначылі дзесяць лепшых спартсменаў Беларусі мінулага года. Першым лаўрэатам стаў вядомы канькабежац, неаднаразовы чэмпіён свету мінчанін Ігар ЖАЛЯЗОЎСКІ. У дзесятку лепшых таксама ўвайшлі: Аляксандр КУРЛОВІЧ (цяжкая атлетыка, Гродна), Алена РУДКОЎСКАЯ (плаванне, Гомель), Таццяна ЛЕДАЎСКАЯ (лёгкая атлетыка, Мінск), Наталля ЗВЕРАВА (тэніс, Мінск), Святлана БАГІНСКАЯ і Віталь ШЧЭРБА(спартыўная гімнастыка, Мінск), Сяргей СМАЛЬ (грэка-рымская барацьба, Гомель), Аляксандр ПАТАШОЎ (лёгкая атлетыка, Віцебск) і Віктар РАНЕЙСКІ (веславанне на байдарках, Бабруйск).

Не цяжка заўважыць, што ў дзесятцы толькі адзін прадстаўнік зімовых відаў спорту. І тут няма чаму здзіўляцца. Калі апошні раз у Беларусі была сапраўдная зіма...

# ЧЭМПІЯНАТУ БЕЛАРУСІ БЫЦЬ

Так, Федэрацыя футбола Рэспублікі Беларусь вырашыла праводзіць незалежны нацыянальны чэмпіянат па футболу. А зусім нядаўна выканкам Федэрацыі зацвердзіў праграму спаборніцтваў на 1992—1993 гг.

У першай лізе (па-савецку — вышэйшай) чэмпіяната рэспублікі будуць удзельнічаць 16 каманд. Першынство-92 пройдзе ў адзін круг з 18 красавіка да 21 чэрвеня. У ім прымуць удзел: «Дынама» (Мінск), «Днепр» (Магілёў), «Дынама») (Брэст), КІМ (Віцебск), «Хімік» (Гродна), «Гомсельмаш» (Гомель), «Металург» (Маладзечна), «Тарпеда» (Магілёў), СКБ «Лакаматыў» (Віцебск), «Тарпеда» (Мінск), «Шахцёр» (Салігорск), «Будаўнік» (Старыя Дарогі), «Трактар» (Бабруйск), БелАЗ (Жодзіна), «Абутнік» (Ліда), «Ведрыч» (Рэчыца).

Згуляўшы па разу адна з адной, каманды выявяць пераможцу. А далей беларускі чэмпіянат пяройдзе на еўрапейскую сістэму — «восень — вясна». І восенню гэтага года пачнецца чэмпіянат 1992—1993 гг. Таксама будзе разыгравацца і Кубак Беларусі па футболу.

Не выключаецца магчымасць, што ўжо ў бягучым годзе Федэрацыя футбола Беларусі стане паўнапраўным членам ФІФА і УЕФА. Тады восенню лепшыя беларускія клубы будуць стартаваць у прэстыжных еўрапейскіх турнірах. Так што барацьба ў чэмпіянаце РБ па футболу абяцае быць вельмі напружанай.

## ФІНІШ

# Ці ўзялі, што маглі?

***Самы час падвесці вынікі першынства Беларусі 1991 года сярод каманд вышэйшых навучальных устаноў. У агульным заліку спартсмены БДУ другія. Больш высокае месца толькі ў БДІФК — яўнага фаварыта першынства, якому наканавана быць лідэрам. Затое ззаду засталіся галоўныя канкурэнты нашых спартсменаў — БДПА.***

Не знайшлося роўных нашай камандзе ў спаборніцтвах па рытмічнай гімнастыцы, шахматах, гіравому спорту і армрэслінгу. Як вынік — першае месца.

Крыху не хапіла да перамогі універсітэцкім дзюдаістам, лыжнікам і лёгкаатлетам (зімой). Але і другое месца — вынік вельмі добры, які да таго ж дае надзею на перамогу ў леташнім першынстве.

Трэцімі альбо бронзавымі прызёрамі сталі дзявочая баскетбольная дружына, мужская каманда па класічнай барацьбе, веласпорту, фехтаванню і цяжкай атлетыцы.

Астатнія вынікі: барацьба самба (5 месца), валейбол (мужчыны — 7 месца, дзяўчаты — 10-е), летнія спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы (5), плаванне (8), футбол (8), хакей (5), спартыўнае арыентаванне (4).

Расчаравалі сваім выступленнем валейбалісты, футбалісты і плаўцы. Умовы для трэніровак, здаецца, створаны неблагія, асабліва для валейбалістаў і плаўцоў. Можа не пашанцавала летась — бывае і такое.

Нельга пакінуць без увагі тых, хто на стадыёнах і ў спартыўных залах адстойваў гонар універсітэта. На спартыўным вечары, што адбыўся 17 снежня, прагучалі іх імёны. Самых-самых з іх мы называем, каб універсітэт ведаў сваіх герояў.

Студэнт 4 курса юрфака Сяргей ДЗЕМЯШКЕВІЧ. Займаецца грэка-рымскай барацьбой, заслужаны майстар спорту СССР. Летась стаў чэмпіёнам СССР, Спартакіяды народаў СССР, Еўропы. Пазалетась выйграў першынство свету.

Другакурснік геафака Віктар БУЛАТ, легкаатлет. У 1991 годзе стаў чэмпіёнам свету ў штурханні ядра сярод моладзі.

Выпускнік фізфака Віталь БРАКАРЭНКА, чэмпіён СССР 1991 года па армрэслінгу.

Студэнт 4 курса мехмата Валерый ЛЯНТНЕР, чэмпіён рэспублікі і ўдзельнік Спартакіяды народаў СССР па гіраваму спорту.

Каманда нашых дзяўчат па рытмічнай гімнастыцы, якая перамагла ў першынстве ВНУ Беларусі: Наталля АМЕЛЬЧАНКА (3 курс геафака), Дар'я МАШАРА (2 курс біяфака), Вольга КАЗАЧКОВА (2 курс юрфака), Святлана ХАТЫЛЁВА (2 курс журфака).

Пяцікурснік філфака Яраслаў АСІПОВІЧ, чэмпіён рэспублікі і першынства ВНУ па армрэслінгу.

Студэнтка 3 курса юрфака Ірына РЫБЧЫК. Летась ёй прысвоена званне майстар спорту па лыжных гонках.

**СПОРТКЛУБ БДУ.**

## РАЗВІТАЛЬНЫ ГІМН

*Не так даўно давялося мне ў Палацы спорту быць сведкам гутаркі двух ужо не маладых мужчын, як высветлілася крыху пазней, аматараў спорту з вялікім стажам. Выказвалі`яны свае незадавальненне як новай уладай, так і яе дзеяннямі, накіраванымі на так званую суверэнізацыю, а на самой справе — на поўны развал.*

*Заўважыўшы маю цікаўнасць, яны растлумачылі: «Лічым, што дэмакратычныя рухі, новае мысленне, суверэнітэт — усё гэта, магчыма, і добра. Але з расцяганнем вялікага спорту па асобных рэгіёнах нельга мірыцца. Для балельшчыкаў, асабліва немаладых, гэта нечаканы ўдар».*

*Так, спорт перажывае сёння нялёгкі перыяд. А вырашыць узнікшыя праблемы, знайсці разумнае рашэнне не лягчэй, чым у палітыцы. Функцыянеры ад спорту пачалі падзел яго па рэспубліках, амаль не зважаючы на думкі спартсменаў і іх прыхільнікаў.*

# Распаўся адзіны «Саюз нерушимых»...

*Пачалася нацыяналізацыя спорту ў 1990 годзе. Балтыя заявілі аб сваім выхадзе з СССР і намеры будаваць самастойныя, незалежныя краіны. Вядома, што і спорт апынуўся па-за межамі Саюза. Праз нейкі час крок убок зрабіла і Грузія.*

*Тады крытыкуемы ўсімі цэнтр пайшоў на кампраміс. Амаль усе саюзныя спаборніцтвы набылі статус адкрытых, г. зн. удзельнічаць у іх маглі і спартсмены замежных краін (у нашым выпадку — рэспублік-адшчапенцаў). Латвія і Эстонія пайшлі на ўступкі Маскве і сёння аб гэтым не шкадуюць. Удзел іх каманд у чэмпіянатах СССР не стаў перашкодай для міжнароднага прызнання і ўключэння ў МАК, ФІБА, ФІФА і іншыя арганізацыі. А Літва і Грузія адмовіліся.*

*Але гэта былі яшчэ кветачкі. Ягадкі ж пачаліся ў канцы мінулага года. І спрыяла гэтаму пазіцыя Украіны, якая надумала ісці ў спорце сваім шляхам. Гэта азначала канец, бо як абноўлены Саюз быў немагчымы без жоўта-блакітных, так і спорту вялікай дзяржавы без Украіны не абысціся.*

*Перспектыва застацца ля разбітага карыта падштурхнула некаторых прадстаўнікоў Расіі ўсур'ёз задумацца пра будучыню свайго спорту. Доўга шукаць выйсце не прыйшлося. Расійскія спартыўныя арганізацыі аб'яўляюць сябе пераемнікамі ўсесаюзных.*

*Што атрымалася? Спаборніцтвы, чэмпіянаты, якія раней былі ўсесаюзнымі, аўтаматычна становяцца расійскімі. І тут ужо, жадаюць таго рэспублікі ці не, яны вымушаны адасабляцца і развіваць спорт у межах сваіх тэрыторый.*

*Але не ўсё так лёгка робіцца, як некаму хацелася б. Новыя праблемы з'яўляюцца раней, чым вырашаюцца старыя. Хто паедзе на зімовую і летнюю Алімпіяды? Калі зборная, то якая, пад якой назвай, з якім сцягам і гербам? Якая зборная ці рэспубліка (а можа ўвогуле — ніхто?) прыме ўдзел у фінальнай стадыі чэмпіяната Еўропы па футболу ў Швецыі? Пакуль адны пытанні. І беспаспяховымі выглядаюць спробы знайсці адказы.*

*Безумоўна, Расія была б не супраць усё вырашыць на сваю карысць. Матывы вядомыя: большасць спартсменаў — рускія. Таму Расія павінна ехаць на Алімпіяду. Яна нават згодна ўзяць некаторых спартсменаў з іншых рэспублік, але пад свае сцягі. З гэтым не могуць пагадзіцца ў рэспубліках. Пакуль вырашылі, што будзе ўсё ж аб'яднаная безназоўная каманда.*

*А што Беларусь? У гэтай сітуацыі яна не кідаецца, прэтэнзій нікому не прад'яўляе і правапераемніка з сябе не робіць. Гэта ўвогуле нядрэнна, хаця сядзець склаўшы рукі таксама нельга.*

*Якія мы маем перспектывы ў развіцці нацыянальнага спорту? Вялікіх ілюзія будаваць нельга. Крыху падумаўшы, азірнуўшыся па баках, Федэрацыя футбола Беларусі прыйшла да высновы, што рэспубліка падрыхтавана, каб праводзіць свой, больш-менш паўнацэнны, самастойны футбольны чэмпіянат, балазе гэты від спорту папулярны ў рэспубліцы. Будуць праводзіцца чэмпіянаты і па астатніх спартыўных дысцыплінах, але... Што рабіць з беларускімі камандамі майстроў, якія раней прадстаўлялі рэспубліку ў вышэйшых лігах савецкага спорту? Уключыць у нацыянальны чэмпіянат? Але ж сапернікі там слабейшыя на некалькі парадкаў.*

*Выйсце трэба шукаць у стварэнні міжнацыянальных спартыўных асацыяцый, накшталт НБА ці НХЛ. У іх выступалі б мацнейшыя каманды былога Саюза. Такое рашэнне задаволіць і шматмільённую армію балельшчыкаў, і самі рэспублікі, бо вопытныя ігракі з гэтых асацыяцый будуць складаць аснову сваіх нацыянальных зборных каманд.*

*Пакуль толькі хакей заявіў аб рашучасці перайсці на прафесійную аснову. І ўжо ў гэтым годзе плануюць адкрыць Прафесійную Хакейную Лігу, у якую ўвайдуць самыя класныя клубы. Дай бог.*

*Але аналіз апошняй інфармацыі з газет сведчыць, што разумныя кампрамісы дасягнуты далёка не паўсюдна, і наперадзе яшчэ шмат напружанай работы.*

*...Колькі год усе мы, балельшчыкі, з задавальненнем крычалі на стадыёнах: «СССР — чэмпіён!» Колькі год беларускі балельшчык хваляваўся за украінскага і рускага спартсмена, а рускі падтрымліваў беларускага канькабежца ці лыжніка. Увогуле тады мы не падзялялі спартсменаў па нацыянальнасцях. І колькі год мы з радасцю слухалі Гімн СССР, які гучаў з нагоды перамог савецкіх спартсменаў, і НІКОЛІ ён не здаваўся нам благім...*

***А. СПАРТЫУНЫ.***

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Цана 5 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
16 студзеня
Зак. 2180.
Т. 1000 экз.
220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.
Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.